# ФАРМІРАВАННЕ МАТЫВАЦЫІ ДА РАБОТЫ З ТВОРАМІ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ З ДАПАМОГАЙ ЛІТАРАТУРНЫХ КВЕСТАЎ

*К.А. Чыкаванава*
*Аршанскі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава*

Доктар педагагічных навук А.А. Лявонава адзначае, што падрыхтоўка будучага настаўніка аб'ядноўвае каштоўнасці і сэнсы духоўнага выхавання, заснаваныя на злучэнні традыцый духоўнасці, маральнасці, каштоўнасцей пазнання і педагагічнай місіі: захавання і перадачы культурнай спадчыны [1, с. 39]. Вялізны патэнцыял фарміравання духоўных каштоўнасцей закладзены ў творах мастацкай літаратуры, таму вучэбныя заняткі літаратурай займаюць асабліваe месца ў сістэме падрыхтоўкі будучых педагогаў.

Аднак на сучасным этапе выкладчыкі літаратуры сутыкаюцца з сур'ёзным выклікам – неабходнасцю фарміравання ўнутранай матывацыі навучэнцаў да вывучэння твораў мастацкай літаратуры. Справа ў тым, што такая матывацыя прысутнічае ў назначнай колькасці сучасных навучэнцаў: прыблізна ў трэцяй часткі першакурснікаў Аршанскага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава. Па выніках апытання, праведзенага ў верасні 2019 года, толькі 29 першакурснікаў – будучых педагогаў, што складае 36,7% з ліку апытаных, чытаюць мастацкія творы, акрамя вывучаемых на занятках; 39% (31 чалавек) падкрэслілі, што на работу з мастацкай літаратурай не маюць часу; астатнія – 19 чалавек (24%) – адзначылі, што мастацкія творы чытаць "проста не цікава". Улічваючы дадзеную акалічнасць выкладчык літаратуры павінен у сваёй рабоце выкарыстоўваць такія тэхналогіі, метады і прыёмы навучання дысцыпліне, якія дазволяць пераадолець названую супярэчнасць пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў – педагогаў.

Пазначанымі поглядамі тлумачыцца актуальнасць праведзенага даследавання. Мэтай даследавання стала вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання літаратурнага квесту на занятках "Беларуская літаратура" для фарміравання ўнутранай матывацыі навучэнцаў да вывучэння твораў мастацкай славеснасці.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання выступілі заняткі "Беларуская літаратура" на 1-2 курсах у Аршанскім каледжы ВДУ імя П.М.Машэрава, арганізаваныя ў форме літаратурных квестаў. Метады даследавання: вывучэнне метадычнай літаратуры, аналіз прадуктаў дзейнасці навучэнцаў, гутаркі з навучэнцамі, назіранні, супастаўленне атрыманых вынікаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пошук шляхоў фарміравання ўнутранай матывацыі да работы з літаратурнымі творамі прывёў да вывучэння, стварэння і выкарыстання на занятках літаратуры квест-тэхналогіі. Дадзеная тэхналогія мае шэраг станоўчых момантаў для выкарыстання ў адукацыйным працэсе:

- гэта нестандартная форма правядзення вучэбных заняткаў;
- яна дазваляе навучэнцам з розным узроўнем падрыхтаванасці актыўна ўключацца ў навучанне;
- форма літаратурнага квесту зразумелая сучасным навучэнцам і запатрабаваная імі;
- квест выступае дзейснай формай навучання з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій;
- дадзеная тэхналогія спрыяе развіццю ўніверсальных вучэбных кампетэнцый і г.д.

Квест-тэхналогія арганічна накладваецца на этапы работы з мастацкім творам на занятках літаратуры. Літаратурны квест уяўляе сабой пэўны цыкл, які складаецца з наступных этапаў: пастаноўка праблемы; выкананне дзеянняў для вырашэння пастаўленай праблемы – "прахожданне маршруту"; знаходжанне адказу на праблемнае пытанне; падрыхтоўка выніковага прадукта; рэфлексія і ацэнка дзейнасці (самаацэнка). Такім чынам, літаратурны квест вымагае праблемнага аналізу мастацкага твора, устанаўлення ўзаемасувязей ў творы, гэта значыць, што тэхналогія спрыяе развіццю крытычнага мыслення, якое, у сваю чаргу, садзейнічае самастойнаму атрыманню ведаў, пошуку рацыянальных шляхоў для вырашэння пэўных праблем, крытычнаму стаўленню да вялікіх аб'ёмаў інфармацыі, якія функцыянуюць у сучасным грамадстве.

Акрамя названых кампетэнцый, літаратурныя квесты спрыяюць і фарміраванню ўнутранай матывацыі да работы з мастакімі творамі, бо напрыканцы праходжання квесту навучэнцаў чакае "прыз": маральнае задавальненне, адзнака за работу на занятку, заахвочванне і інш.

Важным момантам выкарыстання квесту з'яўляецца выбар навучэнцамі той ці іншай ролі і магчымасць "прымерыць" яе на сябе. Ролі, у адпаведнасці з героямі мастацкага твора, могуць быць як станоўчымі, так і адмоўнымі. Так, напрыклад, пры праходжанні літаратурнага квесту па апавяданні К.Чорнага "Макаркавых Волька" навучэнцам былі прапанаваныя наступныя ролі: Волька, Сафрон, незалежны арбітр; пры рабоце з аповесцю У.Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" навучэнцы "выконвалі" ролі Беларэцкага, Яноўскай, Дубатоўка, Дзікага палявання, абвінавачвальніка. Трэба адзначыць, што адмоўныя героі карыстаюцца асаблівай папулярнасцю ў навучэнцаў, іх выбіраюць у першую чаргу. Як адзначылі 61,3% апытаных першакурснікаў, менавіта праз адмоўных герояў больш цікавы пошук вырашэння пастаўленай праблемы, а атрыманыя ў ходзе выканання заданняў "урокі" мастацкага твора найбольш яскарвыя і запамінальныя, а значыць мастацкі твор даходзіць да сэрца чытачоў, выклікаючы ў іх пэўныя пачуцці.

Значная ўвага пры складанні літаратурнага квесту надаецца выкладчыкам падбору заданняў, якія, з аднаго боку, павінны выклікаць цікавасць у навучэнцаў да праходжання квесту, а значыць і да знаёмства з творам, а з другога боку, павінны дапамагаць арганічна выяўляць асаблівасці твора. Заданні квесту могуць уяўляць сабой пытанні розных тыпаў ("тонкія" і "тлустыя", тлумачальныя, удакладняльныя, практычныя, творчыя і інш.), разгадванне крыжаванак і рэбусаў, запаўненне кластараў, стварэнне асобаснага тэксту, складанне сінквейнаў, знаходжанне істотных слоў, выяўленне апісання выгляду і гучання з'явы, асобы (прыём "Як выглядае, як гучыць") і інш.

Зразумела, што пры распрацоўцы літаратурнага квесту выкладчык затрачвае больш часу і намаганняў, чым пры падрыхтоўцы стандартнага тыпу заняткаў: па-першае, заданні не павінны паўтарацца, пераходзіць з квесту ў квест; па-другое, заданні трэба накіроўваць на вырашэнне асноўнай праблемы твора, што складае ядро квесту; па-трэцяе, неабходна вызначыць асноўныя олт, якія прывядуць навучэнцаў да вырашэння супярэчнасцей; па-чацвёртае, падабраны матэрыял неабходна аформіць у квест з дапамогай камп'ютарных сродкаў, каб прыцягнуць увагу падрастаючага пакалення, якое не ўяўляе сябе без розных гаджэтаў, да літаратурных твораў.

**Заключэнне.** Сістэматычнае выкарыстанне квесту на занятках "Беларуская літаратура" станоўча ўплывае на фарміраванне ў навучэнцаў матывацыі да вывучэння мастацкіх твораў. Анкетаванне навучэнцаў 1 курса, праведзенае ў студзені 2020 года (пасля 4 месяцаў сістэматычнага выкарыстання літаратурнага квесту на вучэбных занятках літаратуры), пацвярджае гэта. 92,6% апытаных аддаюць перавагу вучэбным заняткам, арганізаваным у форме літаратурнага квесту; 42,6% навучэнцаў самастойна прачыталі творы М.Зарэцкага, К.Чорнага, І.Мележа, рэкамендаваныя выкладчыкам для дадатковага чытання; 74% адзначылі, што не ачуваюць негатыўных эмоцый, чытаючы праграмныя творы па беларускай літаратуры; 77,8% падкрэслілі, што, праходжанне літаратурнага квесту дапамагае лягчэй разабрацца ў перыпетыях сюжэту і характарах галоўных герояў твораў.

Такім чынам, літаратурны квест спрыяе фарміраванню ўнутранай матывацыі да работы з творамі мастацкай літаратуры, што з'яўляецца важным элементам падрыхтоўкі будучых педагогаў да іх далейшай прафесійнай дзейнасці.

1. Бахчиева, О.А. Проблема формирования духовно-нравственных основ личности будущего учителя / О.А. Бахчиева // Преподаватель XXI век. – 2016. – № 2. – С. 39–43.

## ОСНОВНЫЕ КОММУНИКАТИВНЫЕ СТРАТЕГИИ И ТАКТИКИ АНГЛОЯЗЫЧНЫХ РАДИОДИСКУССИЙ

*Е.А. Ючкович*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

В современном мире средства массовой информации оказывают особое влияние на общественное мнение. Однако механизмы формирования общественного мнения остаются малоизученными и поэтому требуют систематических лингвистических исследований. Радиодискурс, в частности, имеет актуальное значение, поскольку отражает последние тенденции в социальной реальности. В связи с возрастающей потребностью человека получать информацию, обсуждать ее, формировать собственное мнение по тому или иному вопросу, для того чтобы лучше ориен-



Репозиторий ВГУ